## *Адпачынак бацьку*

Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь дапоўнены новым артыкулам 186, згодна з якім пры нараджэнні дзіцяці і выхаванні яго ў сям'і наймальнік абавязаны па жаданні бацькі (айчыма) дзіцяці даць яму адпачынак без захавання заработнай платы працягласцю не больш за 14 каляндарных дзён. Іншая працягласць і (або) аплата водпуску пры нараджэнні дзіцяці могуць быць прадугледжаны калектыўным дагаворам або самім наймальнікам.

Адпачынак бацьку (айчыму) пры нараджэнні дзіцяці прадастаўляецца адначасова па пісьмовай заяве бацькі на працягу шасці месяцаў з даты нараджэння дзіцяці.

Таццяна Вяржынская,
галоўны дзяржаўны інспектар
Смаргонскага міжраённага аддзела
Гродзенскага абласнога ўпраўлення
Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы